# Зялёнае фінансаванне

Развіццё зялёнай эканомікі патрабуе значных інвестыцый у новыя тэхналогіі і сектары, якія стануць асновай будучага эканамічнага росту. У стратэгіі ўстойлівага развіцця і Нацыянальным плане па зялёнай эканоміцы Беларусі гаворыцца пра неабходнасць развіцця зялёнага фінансавання, аднак далей за агульныя згадкі справа не ідзе.

*- На сайце дзяржаўных закупак няма пошуку "зялёных" праектаў, а паводле BEROC 42% апытаных прадпрымальнікаў не разумеюць сутнасці зялёных дзяржаўных закупак.*

*- У снежні 2022 г.Мінфін выпусціў зялёныя аблігацыі, іх набылі расейскія інвестары.*
*- Рэйтынгавае агенцтва BIK у 2022 г. распрацавала ESG-рэйтынг, які ўжо атрымалі БНБ Банк, Белінвестбанк, АшчадБанк, БСБ Банк і Тэхнабанк.*

Некаторыя беларускія банкі ў супрацы з замежнымі і міжнароднымі фінансавымі інстытутамі падтрымлівалі экалагічныя праекты бізнесу. Пасля 2020 г. з-за ўвядзення санкцый міжнародная супраца практычна поўнасцю спынілася.

## Чаму неабходна рэфармаваць сістэму фінансавання зялёнай эканомікі?

Штучнае стрымліванне развіцця зялёнай эканомікі і неспрыяльны інвестыцыйны клімат прывялі да недахопу зялёных праектаў на рынку і сыходу з краіны фундатараў.

1. **Зялёнае фінансаванне не можа развівацца без комплекснай заканадаўчай базы**, сертыфікацыі і верыфікацыі фінансавых інструментаў, спецыялізаваных фондаў і банкаў. Патрабуецца стварэнне нацыянальнай сістэмы, якая ўключае таксанамію зялёных праектаў, аўдыт зялёных фінансавых інструментаў, ацэнку экалагічнай рызыкі.

2. У банкаўскай сферы **зялёнае фінансавання развівалася дзякуючы ініцыятыве банкаў**, без распрацоўкі адпаведнага заканадаўства і дапамогі дзяржавы. Цяпер большасць ініцыятыў прыпыненая з-за спынення міжнароднай супрацы, зніжэння зацікаўленасці дзяржавы, бізнесу і насельніцтва.

3. Фінансавыя арганізацыі і кампаніі Беларусі **не ўдзельнічаюць у міжнародных зялёных ініцыятывах**, такіх як Прынцыпы экватара, не прытрымліваюцца прынцыпаў Міжнароднай асацыяцыі рынку капіталу *(ICMA)* аб выпуску зялёных і ўстойлівых аблігацый, і, адпаведна, не выходзяць на міжнародныя рынкі ўстойлівага капіталу. Гэтыя ініцыятывы сёння цяжка рэалізаваць з-за санкцый і рэпутацыйнай рызыкі для замежных інвестараў, якія не хочуць укладвацца ў «таксічныя» праекты.

Для развіцця зялёнай эканомікі Беларусь можа **выкарыстоўваць досвед Еўрапейскага саюза**. ЕС паставіў мэту перайсці да кліматычна нейтральнай эканомікі, прыняўшы Еўрапейскі зялёны курс (ЕЗК). Для фінансавання палітыкі распрацаваныя комплексная праграма для **перанакіравання інвестыцый на развіццё зялёнай эканомікі** і зялёная таксанамія.

***Зялёная таксанамія*** *вызначае, якія віды дзейнасці з'яўляюцца ўстойлівымі і адпавядаюць экалагічным мэтам: зніжэнне выкідаў, адаптацыя да змены клімату, устойлівае выкарыстанне водных рэсурсаў, цыркулярная эканоміка, зніжэнне забруджвання, абарона і аднаўленне біяразнастайнасці і экасістэм.*

ЕС плануе прыцягнуць больш за 1 трлн. € інвестыцый на працягу 10 гадоў, выкарыстоўваць даходы ад продажу квот на выкіды і стымуляваць бізнес быць больш экалагічным кляхам укаранення ESG-справаздачнасці (ацэнка ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, соцыум, карпаратыўнае кіраванне).

Для палягчэння трансфармацыі эканомікі створаны механізм справядлівага пераходу, платформа тэхнічнага спрыяння і рэкамендацый, планы дзеянняў і шэраг іншых дакументаў.

## Карысць для беларусаў

Развіццё зялёнага фінансавання стане стымулам для развіцця зялёнай эканомікі і росту інвестыцый. Будуць створаныя новыя працоўныя месцы ў фінансавай сферы, дзяржаўным кіраванні, сувязях з грамадскасцю, бізнес-кансультаванні, навуцы і адукацыі. Інвестыцыі дазволяць прадпрымальнікам развіваць вытворчасць і ствараць новыя бізнесы, а ўсім беларусам – атрымаць ільготнае фінансаванне на энергаэфектыўны дом або экалагічны аўтамабіль.

## Як развіваць зялёнае фінансаванне ў Беларусі?

Абавязковымі ўмовамі развіцця зялёнага фінансавання ў Беларусі з'яўляецца станаўленне ўстойлівай эканомікі, паляпшэнне іміджу Беларусі на міжнароднай арэне, стварэнне спрыяльнага інвестыцыйнага клімату і развіццё міжнароднай супрацы.

| Задачы | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Стварыць нарматыўную і метадалагічную базу** | |
| - Распрацоўка законаў і нарматыўных актаў аб зялёным фінансаванні<br>- Прывядзенне нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднай практыкай<br>- Удасканаленне зялёнага падаткаабкладання | - Распрацаваць план дзеянняў для развіцця зялёных фінансаў<br>- Стварыць зялёную таксанамію паводле прыкладу ЕС<br>- Распрацаваць сістэму верыфікацыі і сертыфікацыі зялёных аблігацый і іншых механізмаў<br>- Стварыць метадалогію ацэнкі інвестыцыйнай прывабнасці і экалагічнай эфектыўнасці праектаў<br>- Укараніць правілы зялёнай рызыкі менеджменту ў банках<br>- Увесці нефінансавую справаздачнасць кампаній (ESG)<br>- Стварыць сістэму гандлю квотамі на выкіды $CO_2$ |
| **2. Развіваць зялёныя фінансавыя механізмы** | |
| - Падтрымка зялёных банкаў і праектаў<br>- Далучэнне фінансавых інстытутаў да міжнародных зялёных ініцыятыў<br>- Ацэнка ўстойлівасці фінтэх прадуктаў<br>- Павышэнне экалагічнай і фінансавай пісьменнасці насельніцтва і бізнесу | - Стымуляваць банкі павялічваць долю зялёных праектаў праз рэгуляцыі, падаткі і фінансавую падтрымку з боку дзяржавы<br>- Развіваць зялёныя дзяржаўныя закупкі<br>- Заахвочваць выпуск зялёных аблігацый, крэдытаў, пазык, іпатэкі, страхавых і лізінгавых прадуктаў<br>- Распрацаваць маркіроўку зялёнай іпатэкі<br>- Арганізаваць на Беларускай валютна-фондавай біржы секцыю зялёных даўгавых інструментаў<br>- Стварыць платформу зялёнага фінансавання паводле прыкладу ЕС<br>- Рыхтаваць кадры для экалагічнага менеджменту |
| **3. Развіваць інвестыцыйны рынак** | |
| - Спрыянне развіццю высокатэхналагічных зялёных праектаў<br>- Стварэнне механізму абароны інвестыцый, у т.л. за кошт развіцця страхавання<br>- стварэнне інстытута пенсійных фондаў<br>- Фармаванне экасістэмы зялёных стартапаў<br>- Станаўленне рынку фінтэху<br>- Развіццё венчурнага фінансавання | - Распрацаваць інвестыцыйны план і стратэгію развіцця зялёнай эканомікі Беларусі<br>- Сфармаваць Кліматычны фонд (зялёных падаткаў, продаж квот)<br>- Скараціць колькасць абавязковых відаў страхавання; развіваць лічбавае страхаванне, у т.л. у сферы фінансавання ўстойлівых праектаў<br>- Укараняць прынцыпы ESG пры фінансаванні<br>- Прыцягваць пенсійныя фонды да зялёнага інвеставання<br>- Узмацняць арыентацыю фінтэху на ўстойлівыя праекты<br>- Ствараць інкубатары, акселератары, хакатоны, «пясочніцы»<br>- Удасканальваць заканадаўства ў галіне венчурнага фінансавання<br>- Развіваць рынак экасістэмных паслуг |

### *Крыніцы фінансавання зялёнай эканомікі*

**Рэсурсы зялёнай эканомікі:** нацыянальная сістэма гандлю квотамі на выкіды, экалагічныя падаткі, зніжэнне выдаткаў на сыравіну і энерганосьбіты (да 2% ВУП) і шкоды ад забруджвання паветра і змены клімату (да 6% ВУП), развіцця АКЭ (каля 65 млрд. $ да 2050 г.)

**Унутраныя рэсурсы Беларусі:** прыватызацыя, рэформа дзяржаўных закупак і пенсійнай сістэмы, рэсурсы банкаў і фінансавых інстытутаў, накапленні насельніцтва.

**Міжнародная падтрымка:** План эканамічнай дапамогі для Беларусі (3 млрд. €), праграмы Усходняга партнёрства, ПРААН, ГЭФ.

**Інвестыцыі** ЕБРР, ЕІБ, МФК і іншых фінансавых інстытутаў.

*Аўтаркі: Анастасія Лузгіна, Аляксандра Мамаева*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай*
*Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*